# *На быстрыні жыцця*

Калі кінуць пагляд на ўсё тое, што напісана Іванам Шамякіным за тры з палавінай дзесяцігоддзі творчай працы, яшчэ раз перагартаць апошняе, шасцітомнае выданне яго твораў, то можна пераканальна сказаць, што зроблена многа, арыгінальна і таленавіта.

Па-добраму здзіўляюць багацце і разнастайнасць творчых задум і здзяйсненняў, шматграннасць творчага дыяпазону, пастаянныя актыўныя ідэйна-мастацкія пошукі, а самае галоўнае — нязменная пільная ўвага да актуальных праблем сучаснасці, да вечна жывой, рухомай, зменлівай, складанай рэчаіснасці, да вобраза станоўчага героя, да характару нашага сучасніка.

Яшчэ ў самым пачатку творчага шляху, ідучы ў прамым сэнсе слова па гарачых слядах вайны, І. Шамякін стварыў «Глыбокую плынь».

Гэты раман, па сутнасці, быў першым маштабным творам беларускай пасляваеннай прозы, які паказаў усесаюзнаму чытачу тое, што адбывалася на зямлі часова акупіраванай Беларусі, як зараджаўся, рос і шырыўся партызанскі рух, як ён станавіўся ўсенародным змаганнем супраць фашысцкіх акупантаў.

Асэнсаванне вельмі складаных праблем пасляваеннага перыяду ў жыцці калгаснай вёскі стала галоўным у рамане «У добры час», творы, у якім выявілася, хай і не ва ўсім здзейсненае, імкненне пісьменніка да праўды жыцця, да пераадолення звыклых канонаў і схем, тэндэнцый лакіроўкі цяжкай пасляваеннай рэчаіснасці.

Раман «Крыніцы» з'явіўся ў дні, калі абмяркоўваліся матэрыялы XX з'езда партыі, калі так востра паўсталі пытанні аднаўлення ленінскіх норм партыйнага і грамадскага жыцця, калі адкрываліся новыя далягляды ў развіцці савецкага грамадства. І. Шамякін, ідучы ў нагу з жыццём, добра адчуваючы тэндэнцыі грамадскага развіцця, па-мастацку выкрываў тыя заганныя з'явы ў нашым жыцці (бародкаўшчына), супраць якіх у гэты ж час вяла барацьбу партыя.



Далейшае паглыбленае асэнсаванне і мастацкае вырашэнне праблемы сучаснасці атрымалі ў рамане «Сэрца на далоні». Тут на першым плане — не толькі выкрыццё старога, а і выяўленне новых тэндэнцый жыцця, актыўныя пошукі героя нашага часу. У гэтым творы па-сапраўднаму ўжо заявілі аб сабе мастацкі аналітызм, мастацкае даследаванне рэчаіснасці. Пісьменнік яскрава і пераканальна паказаў, як рэальныя абставіны жыцця, новая грамадская атмасфера ўздзейнічаюць і перайначваюць светаадчуванне, псіхалогію, характар чалавека, адбіваюцца на яго імкненнях, учынках, паводзінах.

На быстрыні жыцця ствараліся раманы «Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль». У іх пульсуюць вострыя, надзённыя праблемы нашага часу, яскрава выяўляюцца найважнейшыя тэндэнцыі і заканамернасці ў развіцці нашага грамадскага жыцця, сучаснага літаратурнага працэсу.

Асабліва пільная ўвага да праблем сучаснасці, да псіхалогіі чалавека нашага часу, эпохі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, адчуваецца ў рамане «Атланты і карыятыды». Як ні ў якім з ранейшых твораў. тут моцны пафас барацьбы за тое, каб навукова-тэхнічны прагрэс адпавядаў сацыяльнаму прагрэсу, ажыццяўляўся дзеля чалавека гуманнымі, маральнымі сродкамі, пафас барацьбы супраць тых праяў у грамадскім, вытворчым, асабістым жыцці, якія прыніжаюць чалавечую асобу, перашкаджаюць ёй раскрыцца лепшымі рысамі характару, замінаюць выяўленню яе творчых магчымасцей, задаткаў, творчых патэнцый.

Характэрна тое, што для І. Шамякіна заўсёды дзень сённяшні бачыцца ў цеснай, непарыўнай сувязі з днём учарашнім, наша хуткаплынная бурная сучаснасць — з вогненным, гераічным і трагічным ваенным мінулым. Вайна жыве ў біяграфіях, успамінах і сэрцах герояў, аказвае прыкметны ўплыў на стан іх душэўнага жыцця, нярэдка вызначае характар іх узаемаадносін («Сэрца на далоні», «Снежныя зімы», «Вазьму твой боль» і інш.). Такімі паўстаюць у творах Яраш, Шыковіч, Антанюк, Батрак...

Трагічная гісторыя Зосі Савіч прымусіла Яраша па-іншаму паглядзець на сувязь гісторыі і сучаснасці. Яраш прыходзіць да вываду аб неабходнасці ў жыцці зыходзіць з урокаў мінулага, заўсёды памятаць аб героіцы і трагедыі вайны, рашуча змагацца за гераічную праўду, за чалавечнасць, давер сярод нашых людзей.

Але найбольш драматычна, назаўсёды ўвайшла вайна ў жыццё Батрака — цэнтральнага героя рамана «Вазьму твой боль». У гэтым творы, хоць ён і пра сучаснасць, раманная канцэпцыя выяўляецца галоўным чынам праз суаднесенасць мінулага з сучасным. Сучаснасць падсвечваецца, шмат у чым вывяраецца гераічным і трагічным мінулым. У мінулым, па сутнасці, сфарміраваліся характары многіх герояў, характар самога Івана Батрака.

Так, сучаснасць і вайна ў творчасці І. Шамякіна цесна з'яднаны. Сам пісьменнік прызнаецца: «І я, лічачы сябе пісьменнікам, які даследуе сучаснасць, не магу даць гарантый каму б то ні было, што і ў будучым рамане... не закрану зноў тэму вайны, непасрэдна ці ўскосна, у якіх-небудзь новых аспектах, хаця раман і будзе расказваць аб падзеях нашага часу...» [1] Так было, так ёсць і, відаць, так будзе, бо ў нашай Перамозе пісьменнік справядліва бачыць вытокі ўсіх сённяшніх здзяйсненняў.

Мастацкая творчасць для І. Шамякіна — гэта перш за ўсё адкрыццё ў жыцці і творчае ўвасабленне чалавечага характару, стварэнне вобраза становчага героя, перадавога чалавека нашага часу. Прыгадаем Лемяшэвіча, Шапятовіча, Яраша, Шыковіча, Антанюка, Карнача, Батрака і інш. Гэтыя героі канцэнтруюць у сабе рысы характару, народжаныя і выхаваныя нашым часам, і перш за ўсё сацыяльную, грамадскую актыўнасць, непрымірымасць да ўсяго таго, што не адпавядае сацыялістычным нормам жыцця, прынцыпам сацыялістычнай дэмакратыі і гуманізму.

Героі твораў І. Шамякіна шмат у чым увабралі ў сябе жыццёвы і духоўны вопыт самога пісьменніка. Найбольш блізкі яму, шмат у чым аўтабіяграфічны Пятро Шапятовіч з кнігі «Трывожнае шчасце». Лепшыя аповесці кнігі («Непаўторная вясна», «Агонь і снег», «Мост») ствараліся непасрэдна на аснове асабіста перажытага, вельмі блізкага, незабыўнага для пісьменніка.

[1] Шамякін І. Размова з чытачом.— Мн., 1973, с. 158—159.

Відаць, поспехі І. Шамякіна ў стварэнні вобразаў станоўчых герояў шмат у чым іменна і залежалі ад удалага, з пачуццём мастацкай меры і мэтазгоднасці, спалучэння ў іх суб'ектыўнага (асабістага, аўтабіяграфічнага) і аб'ектыўнага (абагульненага, агульназначнага). Пісьменнік не апускаўся да голай эмпірыкі, простага капіравання, фіксацыі ўсяго аўтабіяграфічнага, што было перажыта дзень за днём у ваенны і пасляваенны час, гэтак жа як рэдка ён і адрываўся ад аб'ектыўнай рэчаіснасці, рэдка трапляў у сферу чыстай мастацкай фантазіі. (На асобныя моманты такога, адарванага ад жыцця, спрошчана рамантызаванага паказу ў кнізе «Трывожнае шчасце» ў свой час крытыка звяртала ўвагу.)

І. Шамякін, як мала хто з беларускіх празаікаў, шматгранны ў сваіх творчых пошуках, у стварэнні самых розных сацыяльных характараў-тыпаў, розных не толькі па ўзросту, прафесіі, роду заняткаў, месцажыхарству, але і па ўзроўню інтэлектуальнага развіцця, сацыяльнай актыўнасці, мэтанакіраванасці. У гэтым выяўляюцца вялікія здольнасці празаіка пераўвасабляцца, добра адчуваць ідэйна-маральную дамінанту характару, як бы станавіцца на месца таго або іншага героя ў жыцці.

Сёння найбольш значныя мастацкія здабыткі ў творчасці І. Шамякіна па стварэнні вобраза нашага сучасніка наглядаюцца ў раманах «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды». Тут цэнтральныя героі — равеснікі пісьменніка, людзі, блізкія яму па жыццёвым і духоўным вопыце. Меншыя здабыткі — у стварэнні вобразаў маладых герояў.

І тым не менш нават характар беларускага юнака дарэвалюцыйнага часу Піліпа Жменькі з аповесці «Першы генерал» раскрыты псіхалагічна глыбока і пераканальна. Абгрунтавана паказаны яго нялёгкі жыццёвы шлях, працэс далучэння да рэвалюцыйнай, ленінскай праўды. І тут вельмі да месца быў зварот да шчырага непасрэднага апавядання ад першай асобы.

У аповесці «Шлюбная ноч» І. Шамякін таксама звяртаецца да формы «я-герой», формы, якая адкрывае вялікія магчымасці для кожнага пісьменніка ў глыбокім самавыяўленні характару, але адначасова з

гэтым і шмат у чым абмяжоўвае яго. Вядома, пісьменнік і раней звяртаўся да гэтай формы (аповесці «Непаўторная вясна», «Агонь і снег» з кнігі «Трывожнае шчасце», аповесць «Ах, Міхаліна, Міхаліна»). Аднак у дадзеным выпадку яму вельмі цяжка было «пераўвасабляцца», раскрываць самае інтымнае і патаемнае ў душы і псіхалогіі юнай партызанкі Валі. І тым не менш многае ўдалося паказаць дакладна, глыбока, праўдзіва і пераканальна. Асабліва адносіны да Машы, прысланай з-за лініі фронту да партызан. Тут і захапленне, і любаванне, і зайздрасць, і рэўнасць, якая мяжуе з нянавісцю...

І ўсё ж у некаторых мясцінах не бачна тут натуральнасці паводзін і тонкасці адчуванняў юнай летуценнай дзяўчыны, якая чакае свайго каханага, радуецца і баіцца свайго ўсёпаглынальнага пачуцця.

Вельмі цікавыя характары створаны ў аповесці «Гандлярка і паэт». Можа здацца, што тут стаіць дылема: хто здатны на подзвіг — летуценны юнак Алесь, патрыятычна настроены, але яшчэ не загартаваны ў жыцці і барацьбе, ці несвядомая, простая жанчына Вольга, якая, аднак, не страціла народнага разумення дабра і зла і ў цяжкую для народа і краіны часіну выявіла свае патэнцыяльныя магчымасці ісці на подзвіг, ахвяраваць жыццём. Аднак, думаецца, такой дылемы не існавала для пісьменніка. Ён, відаць, проста імкнуўся паказаць складаныя і розныя шляхі, якімі ішлі савецкія людзі да разумення неабходнасці рашучага супраціўлення ворагу, неабходнасці ўсенароднага партызанскага змагання.

У цэнтры аповесці «Гандлярка і паэт» характары складаныя. І гэта добра, што Шамякін выявіў тут сябе як пісьменнік, які даследуе жыццёва супярэчлівыя характары, раскрываючы іх галоўным чынам праз побыт.

На першы погляд цяжка ўявіць жанчыну, хай сабе і з асяроддзя мяшчан і гандляроў, якая ў пачатку вайны прагна займалася марадзёрствам, са зларадасцю суправаджала свістам адступленне нашых войск, бойка гандлявала ўсім, чым можна было гандляваць, і разам з тым, нягледзячы на скнарлівасць, выратавала за золата чужога чалавека, ваеннапалоннага, уключылася ў барацьбу, стала падпольшчыцай, пайшла на самаахвярны подзвіг...



Так, І. Шамякін, асабліва ў апошні час, працягвае актыўныя мастацкія пошукі, выпрабоўвае самыя розныя прыёмы і сродкі псіхалагічнага аналізу. Усё часцей ён пераходзіць ад так званага «дынамічнага» псіхалагізму (раскрыцця характараў галоўным чынам праз дзеянне) да самых разнастайных яго форм. Прыкметна суб'ектывізуецца апавяданне, усё часцей героі застаюцца сам-насам, выяўляюць свой псіхічны стан ва ўнутраным маналогу, у форме няўласна-простай мовы (Антанюк у «Снежных зімах», Карнач у «Атлантах і карыятыдах», Батрак у рамане «Вазьму твой боль», Гапанюк у аповесці «Гандлярка і паэт»).

Вельмі цяжка расчляніць, вылучыць моўныя плыні, што належаць аўтару і яго герою, напрыклад, у тых месцах рамана «Вазьму твой боль», дзе перадаюцца роздумы і перажыванні Батрака ў сувязі з вяртаннем у вёску былога паліцая Шышкі, які расстрэльваў яго родных. «Ударыла кроў. У патыліцу, у скроні, у твар. Зазвінела ў вушах. Калыхнуліся і паплылі ўдалеч усе, хто сядзеў у прэзідыуме».

І. Шамякін ідзе ад знешняга (апісанне працоўнай дзейнасці Батрака, яго побыту) праз няўласна-простую мову да раскрыцця ўнутранага, духоўнага стану, да непасрэднага самавыяўлення душы героя. Гэта дазваляе пісьменніку як найлепш паказаць складанае, драматычнае, духоўнае жыццё героя, выбар ім сваёй лініі паводзін, сваёй жыццёвай пазіцыі, асабліва тады, калі на яго абрынуліся жахі ўспамінаў ваеннага часу.

Як бачым, пачынае пераважаць суб'ектыўнасць успрымання і ацэнкі, герой становіцца як бы паверараным пісьменніка, выразнікам яго канцэпцыі, разумення жыцця з яго заканамернасцямі і тэндэнцыямі развіцця.

І хоць характары, як правіла, раскрываюцца ў сферы побыту, І. Шамякін паспяхова пераадольвае бытавізм, падымаецца над ім, прыходзіць да паказу сучаснага быцця героя ў цеснай сувязі са зменамі ў духоўным клімаце нашага грамадства, нашага часу, паказвае яго духоўнае ўзбагачэнне.

І ў дасягненні поспехаў на гэтым шляху дапамагае пісьменніку высокае майстэрства сюжэтабудавання. І. Шамякін — прызнаны майстар дынамічна вострага сюжэта, не пазбягае ён іншы раз для драматызацыі падзей нават дэтэктыўных элементаў. І гэта, як праві-

ла, не шкодзіць праўдзівасці твораў, калі ёсць адчуванне мастацкай меры і мэтазгоднасці. Часцей за ўсё такія элементы звязаны з паказам падзей вайны. Вядома, вайна сапраўды стварала такія сітуацыі, якія не змог бы прыдумаць самы вопытны майстар прыгодніцкай літаратуры. Ну а што датычыць асобных выдаткаў, напрыклад, у кнізе «Трывожнае шчасце», то аб іх ужо гаварылася. Відаць, можна таксама спрачацца наконт лагічнасці і псіхалагічнай абгрунтаванасці развязак у фінальных сцэнах аповесці «Гандлярка і паэт», рамана «Вазьму твой боль». Аднак гэта прыватныя моманты. Сюжэт у творах І. Шамякіна — найважнейшы мастацкі сродак драматызацыі апавядання, вырашэння канфліктаў, раскрыцця характараў, а гэта значыць і ўвасаблення аўтарскай канцэпцыі чалавека, аўтарскага разумення жыцця наогул.

Інтэнсіўнасць і разнастайнасць творчых пошукаў І. Шамякіна выяўляюцца ў тым, што ён плённа выступае як драматург, сцэнарыст, аўтар твораў для дзяцей і юнацтва. Тут таксама бачацца важныя тэндэнцыі сучаснага літаратурнага працэсу — павышаная ўвага да маральна-этычных праблем, да нялёгкіх пошукаў маладымі героямі свайго месца ў жыцці, свайго разумення яго сэнсу, жыццёвай мэты. Асабліва гэта характэрна для п'ес «Экзамен на восень», «І змоўклі птушкі».

Прыхільна, з цікавасцю была сустрэта кніга І. Шамякіна «Размова з чытачом». Артыкулы, выступленні, дзённікі» (1973). Аднак справа не толькі ў разнастайнасці жанраў. Творчая індывідуальнасць пісьменніка і ў прозе раскрываецца ўсё новымі гранямі, выяўляюцца новыя патэнцыяльныя магчымасці ў ідэйна-тэматычным і жанрава-стылёвым пашырэнні дыяпазону творчасці.

Так, І. Шамякін да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна значна папоўніў і ўзбагаціў арыгінальнымі цікавымі творамі беларускую літаратурную Ленініяну («Хлеб», «Першы генерал», «Эшалон прайшоў», «Браняпоезд «Таварыш Ленін»).

Знаходзячыся на быстрыні грамадскага жыцця, народны пісьменнік БССР Іван Пятровіч Шамякін па-ранейшаму — у актыўных творчых пошуках, якія абяцаюць новыя мастацкія здабыткі і здзяйсненні.

*1981*